# ИСТОРИЯ

**НОВІКАЎ С.Я., кандыдат гістарычных навук, дацэнт**



**Рэцэнзент ЛІПЕЦКІ Э. А., кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

## Гісторыя нацысцкай акупацыі Беларусі (1941—1944 гг.): навуковае асэнсаванне ваеннай праблематыкі айчыннымі і замежнымі гісторыкамі

Калі ў 90-я гг. XX ст. у замежнай гістарыяграфіі з'явіліся новыя працы аб гісторыі нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі, айчынныя даследчыкі былі пастаўлены перад складаным выбарам: альбо заставацца ў рамках распрацаваных раней метадалагічных падыходаў, захоўваючы ў беларускай гістарычнай навуцы традыцыйныя канцэпцыі аб "Вялікай Айчыннай вайне" і "нямецка-фашысцкім акупацыйным рэжыме"; альбо ў айчынную гістарыяграфію інтэграваць новыя метадалагічныя падыходы, адпавядаючыя найноўшым навуковым тэндэнцыям у вывучэнні гісторыі другой сусветнай вайны; альбо імкнуцца да аб'ектыўнага аналізу гістарычных падзей, разглядаючы іх у адпаведнасці з парадыгмамі ці ваеннай гісторыі, ці гісторыі вайны, ці гісторыі акупацыі Беларусі.

Сягоння неабходнасць такога выбару тлумачыцца тым, што традыцыйныя прыёмы даследу ўжо не адпавядаюць патрэбам часу, асабліва калі разглядаць вынікі навуковай працы ў кантэксце міжнароднага асэнсавання праблем гісторыі другой сусветнай вайны і тэмы нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі? Такі падыход вымагае і ад аўтара гэтага артыкула: *па-першае,* асаблівай увагі да сучаснай германскай гістарыяграфіі і яе асноўных навуковых канцэпцый; *па-другое,* разгляду айчыннай літаратуры і даследчыцкіх падыходаў, звяртаючы пры гэтым увагу толькі на новыя прынцыпова важныя моманты, пазіцыі і ацэнкі.

Звернемся спачатку да найноўшых прац германскіх гісторыкаў — *Вольфганга Бенца, Ганеса Геера, Хрысціяна Герлаха, Хартмута Ленгарда, Паўля Коля, Бернгарда К'яры, Рольфа-Дзітэра Мюлера, Рольфа Міхаэліса, Герда Р. Юбершэра і інш.*, хто ў 90-я гг. імкнуўся не столькі пашырыць і паглыбіць веды, колькі змяніць фармат самога навуковага доследу па гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі. На старонках найноўшых нямецкамоўных выданняў тэма здабыла асаблівую актуальнасць, знайшла новае канцэптуальнае асэнсаванне і нават набыла адметную ступень навуковай рэпрэзентатыўнасці [1]. Такое стала магчыма дзякуючы таму, што даследчыкі зрабілі рашучы крок па пераасэнсаванні зместу шэрагу гістарычных падзей, іх адэкватнай характарыстыкі і навукова абгрунтаванай ацэнкі. Як паказвае вывучэнне згаданых навуковых прац, крытэрыямі такога доследу з'яўляліся: новыя метадалагічныя падыходы, перагляд старых пунктаў погляду ці іх пацверджанне на сучасным навуковым узроўні, удакладненне методыкі даследчага пошуку, замена паняційнага апарату, ліквідацыя ўсіх "табу" на вывучэнне мінулага, а таксама беспераашкодны доступ да архіўных фондаў, выяўленне і апрацоўка новых дакументальных крыніц і г.д.

Германскія даследчыкі здолелі прыйсці да такога выніку таму, што на рубяжы 80—90-х гг. яны былі падрыхтаваны ўнутрана да змены навуковай парадыгмы ваеннай гісторыі і таму падтрымалі ідэю аб акупацыйнай палітыцы нацысцкай Германіі на захопленай тэрыторыі Савецкага Саюза як самым "вялікім злачынстве з гісторыі нацысцкага панавання над Еўропай" [2]. Пры гэтым прызнанне такога метадалагічнага падыходу стала магчыма толькі пасля таго, як даследчыкі засяродзілі сваю ўвагу перш за ўсё на вывучэнні практыкі вынішчэння людзей, а не толькі на праблемах тэорыі, стратэгіі і тактыкі ваенных бітваў, перамогах германскага вермахта, гераізму яго афіцэраў і салдат.

Галоўным здабыткам творчай працы германскіх даследчыкаў 90-х гг. можна лічыць іх адмову ад традыцыйнай формулы уніфікацыі гісторыі другой сусветнай вайны і выкарыстанне для яе канцэптуальнага асэнсавання розных, перш за ўсё альтэрнатыўных метадалагічных падыходаў. Менавіта ў рамках новых падыходаў замежная гістарыяграфія здолела вынесці на суд спецыялістаў-гісторыкаў і шырокай грамадскасці сваю новую навуковую канцэпцыю ваеннай агрэсіі нацысцкай Германіі на ўсходзе, якая разглядалася як частка другой сусветнай вайны, аднак навукова была акрэслена як "вайна Германіі супраць СССР" [3].

У кантэксце гэтага падыходу сучасная германская гістарычная навука вызначае сутнасць вайны на ўсходзе, характэрныя рысы якой праяўляліся ў тым, што: вайна супраць СССР была загадзя спланаваным актам агрэсіі; вайна пераўтварылася з захопніцкай у вайну на вынішчэнне на працягу часу ад распрацоўкі плана "Барбаросы" да "Загада аб камісарах"; захопленыя тэрыторыі СССР адразу разглядаліся ў якасці "новай жыццёвай прасторы"; шляхам голаду мясцовага насельніцтва Усход павінен быў стаць харчовай жытніцай Германіі; вермахт быў непасрэдным выканаўцам палітыкі масавых забойстваў на акупаванай тэрыторыі; меў месца спланаваны генацыд яўрэйскага насельніцтва; дырэктыўная прадвызначанасць бяспраўнасці савецкіх ваеннапалонных; выкарыстанне прымусовай працы савецкага мірнага насель-

ніцтва ў Германіі; правядзенне палітыкі выпаленай зямлі з боку адступаючых германскіх армій [4].

Такім чынам, менавіта новыя метадалагічныя падыходы замежных гісторыкаў далі мажлівасць зразумець своесаблівасць вайны Германіі супраць СССР, выявіць яе прычыны і іх узаемасувязь, паказаць сапраўднае месца ў гісторыі германа-савецкай вайны: не столькі гісторыі ваенных аперацый, колькі ўсяго спектра знешніх, унутраных, палітычных, эканамічных, сацыяльных падзей ваеннай гісторыі ці гісторыі вайны. Гэта азначае, што гістарыяграфічную карціну сучаснай гістарычнай навукі ФРГ вызначае тэндэнцыя, адлюстраваная ў форме рознабаковага падыходу да "вайны Германіі супраць СССР" [5].

Апрача таго, асаблівасцю сучаснай германскай гістарыяграфіі з'яўляецца праца па прынцыповым пераглядзе паняційнага апарату, яго рашучага пераасэнсавання ў рамках толькі навукова і канцэптуальна распрацаваных высноў. Найбольш яскрава гэта тэндэнцыя адлюстравана на прыкладзе афіцыйнага выкарыстання гістарычнай тэрміналогіі ў дачыненні да такога азначэння як "фашызм". Разгляд новых навуковых прац сведчыць, што доўгі час у літаратуры панавалі розныя канцэпцыі, прыхільнікі якіх прытрымліваліся самых супярэчлівых падыходаў пры апісанні сутнасці згаданых гістарычных тэрмінаў. Аднак большасць даследчыкаў схіляецца да такіх зыходных ідэй, з якіх бяруць на ўзбраенне характарыстыкі гістарычнага ці навуковага, а не ідэалагічнага кшталту. Таму ў сучаснай германскай гістарыяграфіі замацоўваецца падыход, з якога вынікае, што натуральнымі з'явамі еўрапейскай гісторыі перыяду другой сусветнай вайны былі: нацызм у Германіі, фашызм у Італіі і бальшавізм у Савецкім Саюзе [6].

Ключавой праблемай, якая ў апошняе дзесяцігоддзе набыла значны інтарэс, была тэма аб ролі вермахта ў другой сусветнай вайне і вайне Германіі супраць СССР. Як вядома, разгляд гэтага прынцыповага пытання ў ФРГ з'явіўся жорсткім выпрабаваннем для ўсяго грамадства, а не толькі для гісторыкаў. Прычым на старонкі германскай гістарыяграфіі праблема аб злачынствах вермахта ўпершыню трапляе толькі ўвосень 1991 г. дзякуючы таму, што некаторыя навукоўцы рашуча адышлі ад старых падыходаў і імкнуліся весці свой даследчыцкі пошук у адпаведнасці з гістарычнай праўдай. Аб'ектыўны адказ на гэта пытанне азначаў: *па-першае,* крах міфа аб "чыстым вермахце"; *па-другое,* прарыў у масавай свядомасці і *па-трэцяе,* ліквідацыю апошняга з "табу часоў нацызму" [7]. Характарыстыка вермахта як аднаго са "слупоў" нацысцкага акупацыйнага рэжыму не была нечаканасцю для шэрагу германскіх даследчыкаў, вядучых спецыялістаў розных навуковых устаноў, ваенна-гістарычных і архіўных цэнтраў, дзе імкнуліся знайсці тыя навуковыя абгрунтаванні, якія б з'яўляліся адэкватнымі гістарычнай рэчаіснасці і дакументальным крыніцам.

Апрача таго, стварэнне новых магчымасцей для пераасэнсавання гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі прывяло германскіх даследчыкаў да заключэння: "ні адну краіну другая сусветная вайна не закранула так моцна, як Беларусь" [8].

Аналіз найноўшай замежнай гістарыяграфіі "вайны Германіі супраць СССР" садзейнічаў да ўсяго і высвятленню мала- ці зусім нераспрацаваных бакоў гэтай праблемы, у тым ліку:

— ролі "ўсходняга міністэрства" Розенберга на апошнім этапе існавання на-

цысцкага акупацыйнага рэжыму на занятых усходніх тэрыторыях, у тым ліку ў Беларусі;

— аналізу сутнасці нацысцкай акупацыйнай палітыкі ў святле новых навуковых падыходаў, альтэрнатыўных ацэнак і дакументальных крыніц;

— вывучэння дзейнасці ваеннай адміністрацыі, тым больш, што значная частка акупаванай тэрыторыі СССР (як і Беларусі. — **С.Н.**) знаходзілася якраз у зоне дзейнасці вермахта і яго службаў;

— асобай адказнасці пры даследаванні гісторыі партызанскай вайны, прычым без перабольшвання яе ваенных і гераічных аспектаў, а таксама без уліку традыцыйных падыходаў камуністычнага мінулага;

— адыходу ад тых пануючых легенд, якія стварыла вакол сябе камуністычная партыя як арганізатар усенароднай барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў;

— пераасэнсавання ваеннай гісторыі краін былога СССР, аднак пад вуглом гісторыі вайны, гісторыі людзей, гісторыі іх "будзённага жыцця" ва ўмовах акупацыі;

— фундаментальнага даследавання лёсу савецкіх ваеннапалонных і остарбайтэраў і інш. [9].

Пры гэтым у найноўшых гістарыяграфічных працах ФРГ адзначаецца, што аб'ектыўная патрэба ў інтэнсіўнай распрацоўцы большасці з гэтых праблем існуе не толькі для даследчыкаў Германіі, але і іншых краін, асабліва краін былога СССР, г.зн. і Беларусі [10].

З гэтага вынікае, што сёння айчынным гісторыкам ужо нельга абысціся без уліку здабыткаў сучаснай германскай гістарыяграфіі: яе канцэптуальных высноў аб ваеннай гісторыі, новых дакументальных крыніц па гісторыі вайны і навуковых ацэнак нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі і г.д. Гэта тым больш важна, што германскія вучоныя займаліся даследаваннем ваеннай праблематыкі не ізалявана, а сумесна з навукоўцамі розных краін, грунтоўна распрацоўваючы старонкі гісторыі нямецкага народа.

На такім фоне паспрабуем параўнаць навуковыя здабыткі, да якіх прыйшлі гісторыкі ФРГ і Беларусі ў 90-я гг., а таксама высветліць кропкі ўзаемадакранання ці несупадзення даследчыцкіх пошукаў, знайсці вузкія месцы ў вывучэнні ваеннай гісторыі, гісторыі вайны і гісторыі акупацыі Беларусі.

Звернемся толькі да аднаго, самага найноўшага выдання, падрыхтаванага Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і выдадзенага вясной 1999 г. пад назвай *"Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства" (Мінск, 1999. — 253 с.).* Пра яго важнасць сведчыць тое, што праца заяўлена як "першая спроба падвядзення вынікаў і дасягненняў айчыннай гістарыяграфіі па дадзенай праблеме за пасляваенны перыяд" [11]. Такое заключэнне часткова абгрунтавана нават тым, што сярод аўтараў гістарыяграфічных і крыніцазнаўчых нарысаў — вядучыя спецыялісты-гісторыкі А.А. Каваленя, Г.Д. Кнацько, У.І. Кузьменка, А.М. Літвін, С.С. Рудзянкова і М.Ф. Шумейка, якія падрабязна спыніліся на розных пытаннях, у тым ліку: арганізацыі навуковых даследаванняў па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў 40—90-я гг.; архіўных дакументальных крыніцах аб ан-

тыфашысцкай барацьбе на Беларусі; мемуарнай літаратуры аб партызанскім руху на Беларусі 1941—1944 гг.; савецкай палітычнай прапагандзе на акупаванай тэрыторыі Беларусі; гісторыі стварэння і баявой дзейнасці партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі; дзейнасці моладзі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; трагедыі і пакутах народа (фашысцкі акупацыйны рэжым на старонках выданняў); ратным подзвігу ўраджэнцаў Беларусі на франтах вайны і ў еўрапейскім руху Супраціўлення; працы насельніцтва Беларусі ў савецкім тыле і пасля выгнання захопнікаў; культуры Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў адлюстраванні публікацый.

Нават фрагментарны разгляд тэматыкі сведчыць, на якія тэарэтычныя падыходы абапіраюцца прыхільнікі сучаснай парадыгмы ваеннай гісторыі Беларусі. Пакінем пакуль па-за межамі нашага вывучэння змест гэтай важнай гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай працы сучаснай беларускай навукі. Звернем увагу на адзін з метадалагічных момантаў, які знайшоў сваё адлюстраванне ў назве самога выдання і назвах асобных нарысаў. Як бачна, сёння для беларускіх гісторыкаў зыходнай навуковай парадыгмай з'яўляецца "гісторыя Вялікай Айчыннай вайны". Адразу ўзнікае пытанне, а як такая навуковая выснова стасуецца з ужо вядомай нам з германскай гістарыяграфіі назвай "вайна Германіі супраць СССР"? Тым больш, што лагічна ўзнікае і адваротная назва — "вайна СССР супраць Германіі". З прыняццем такіх азначэнняў паўстае наступнае пытанне, а што ў згаданых назвах пярэчыць гістарычнай рэчаіснасці ці не адпавядае гістарычным фактам? Альбо выходзіць за рамкі аб'ектыўнай навуковай ацэнкі "германа-савецкай ці савецка-германскай вайны"?

Да ўсяго падставай для падобных навуковых, навучальных і выхаваўчых разважанняў з'яўляюцца найноўшыя энцыклапедычныя выданні 90-х гг., у якіх беларускага чытача, студэнта, школьніка пакідаюць перад складаным выбарам: якую ж назву мела ў сапраўднасці тая гістарычная падзея, якая ў найноўшых беларускіх выданнях падаецца пад рознымі азначэннямі: "Вялікая Айчынная вайна 1941—1944" [12], "Вялікая Айчынная вайна 1941—45" [13], "Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—45" [14], "Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза супраць фашысцкай Германіі"[15]. Адразу ўзнікае лагічнае пытанне, чаму чытача пакідаюць без тлумачэнняў у дачыненні да самой гістарычнай назвы, асабліва з улікам пэўнай гістарычнай спецыфікі тых трагічных падзей у Беларусі? Ці ўсе згаданыя вышэй назвы можна паставіць на адзін узровень у рамках канцэпцыі нацысцкай акупацыі Беларусі? Як тады неабходна разглядаць гістарычныя і навуковыя назвы, да якіх прыйшлі ў сучаснай германскай гістарыяграфіі: "германа-савецкая вайна", "вайна Германіі супраць СССР", "вайна Гітлера на ўсходзе", "другая сусветная вайна" і інш.? Што ў гэтым выпадку бліжэй да навуковай ісціны і гістарычнай рэчаіснасці? Альбо як быць з новымі канцэпцыямі і падыходамі да гістарычнай тэмы "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне", калі зыходзіць з таго, што ў 2000 г. у беларускай гістарыяграфіі пабачыла свет праца пад назвай "Акупацыя Беларусі (1941—1944)" [16], аўтарам якой з'яўляецца адзін з лепшых знаўцаў ваеннай гісторыі Беларусі — прафесійны гісторык, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН РБ А.М. Літвін. Такая назва, выказаная спецыялістам-даследчыкам у дачыненні да

гістарычнай падзеі, ужо не можа застацца незаўважанай. Тлумачэнні да ўведзенага азначэння патрэбны, на наш погляд, як па вышэй акрэсленых прычынах, так і на падставе выкарыстання новых метадалагічных падыходаў для вывучэння ваеннай гісторыі, гісторыі вайны і гісторыі акупацыі Беларусі.

Шмат цікавага пакінула беларускім даследчыкам і навукова-тэарэтычная канферэнцыя *"Праблемы айчыннай гістарыяграфіі"* [17], якая адбылася ў Гародні ў студзені 2001 г. Аб важнасці форума сведчаць некалькі момантаў: па-першае, факт правядзення міжнароднай канферэнцыі па адной з самых актуальных праблем сучаснай гістарычнай навукі; па-другое, спроба выкарыстання беларускімі даследчыкамі новых метадалагічных падыходаў і патрэба ў змене парадыгмаў у навуковых даследаваннях; па-трэцяе, імкненне да крытычнага аналізу сучаснага стану беларускай гістарычнай навукі і вызначэння кірунку яе далейшага руху наперад і інш.

У даследчыкаў ваеннай гісторыі, гісторыі вайны і гісторыі акупацыі Беларусі гэта канферэнцыя пакінула своеасаблівы адбітак, паколькі на ёй падчас дыскусіі прагучала катэгарычнае меркаванне аб тым, што ў краіне нават з выданнем працы (маецца на ўвазе кніга "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства". — **С.Н.**), як адзначае адзін з яе навуковых рэдактараў і сааўтараў — гісторык А.М. Літвін: "мы не здолелі напісаць гістарыяграфію. Чаму? Гістарыяграфіі не было, бо не было навуковых спрэчак" [18]. Аднак ці можна цалкам пагадзіцца з такой ацэнкай, без навуковага абмеркавання прымаць яе і такім чынам адмаўляць факт актыўнай працы беларускай гістарычнай навукі?

Звернемся толькі да падзей двух апошніх гадоў і адразу адзначым, што за гэты час: 1) былі абаронены дзве доктарскія дысертацыі па ваеннай тэматыцы [19]; 2) праведзены дзве навуковыя канферэнцыі і два "круглыя сталы" [20]; 3) гісторыкамі вёўся актыўны пошук новых канцэпцый і падыходаў [21]. Да ўсяго, менавіта ў гэты час была акрэслена тая агульная праблематыка і навуковая тэматыка, вырашэнне ці распрацоўка якіх стаяць на парадку дня сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, напрыклад:

— адмаўленне ад састарэлых схем, штампаў і стэрэатыпаў у асвятленні гісторыі партызанскай барацьбы і падполля на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

— дэталёвае і непрадузятае асэнсаванне пытанняў арганізацыі барацьбы ў тыле ворага, дзейнасці савецкіх людзей у варожым тыле на базе новых архіўных матэрыялаў;

— уніфікацыя навуковай тэрміналогіі, паняційнага апарату, выпрацоўка крытэрыяў аднолькавага падыходу ў асвятленні і тлумачэнні важнейшых пытанняў гераічнай барацьбы ў гады акупацыі Беларусі;

— распрацоўка праблем калабарацыянізму, супрацоўніцтва з ворагам і дзейнасці беларускіх калабарантаў;

— даследаванне невядомай старонкі з гісторыі беларускай моладзі, якая добраахвотна выехала ці была вывезена гвалтоўна ў Германію;

— дэталёвай апрацоўкі патрабуе лёс савецкіх ваеннапалонных на акупаванай тэрыторыі Беларусі;

— не стае шырокага і глыбокага асвятлення гісторыі дзейнасці германскіх акупацыйных установ, арганізацый, службаў на тэрыторыі Беларусі;

— ад сучасных даследчыкаў айчыннай ваеннай гісторыі чакаюць актыўнага выкарыстання новых падыходаў пры стварэнні навуковага падмурка для глыбокіх гістарычных ведаў [22].

Пералік гістарычных пытанняў і навуковай праблематыкі наглядна паказвае: перад айчыннай гістарыяграфіяй пакуль стаіць надзвычай складаная задача — альбо заставацца ў рамках распрацаваных раней метадалагічных падыходаў, альбо ведаць сапраўдную гісторыю нацысцкай акупацыі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны. Сярод тых шляхоў, якія могуць хутчэй прывесці да яе вырашэння, з аднаго боку — зварот да навуковых здабыткаў і новых метадалагічных падыходаў германскіх гісторыкаў, а з другога — сумесныя пошукі новых шляхоў для грунтоўнага, аб'ектыўнага і адэкватнага вывучэння гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі ў 1941—1944 гг.

---


1. Einsatz im "Reichskommissariat Ostland": Dokumente zum Voelkermord im Baltikum und in Weissrussland 1941—1944 / hrsg. von *Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Juergen Matthaeus.* Berlin: Metropol, 1998. 301 S.; *Chiari Bernhard.* Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941—1944. Duesseldorf, 1998. 380 S.; *Gerlach Christian.* Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. 1232 S.; *Heer Hannes/ Naumann Klaus.* Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944. Hamburg, 1995. 678 S.; *Lenhard Hartmut.* "Lebensraum im Osten": Deutsche in Belorussland 1941—1944. Duesseldorf, 1991. 312 S; *Kohl Paul.* Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei 1941—1944. Frankfurt a.M., 1994. 324 S.; *Michaelis Rolf.* Das SS-Sonderkommando Dirlewanger: ein Beispiel deutscher Besatzungspolitik in Weissrussland. Berlin, 1998. 217 S.; *Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R.* Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. Darmstadt, 2000. 451 S.; Handbuch der Geschichte Weissrusslands / hrsg. von Diertich Beyrau und Rainer Lindner. Goettingen, 2001. 543 S. u.a.

2. *Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R.* Hitlers Krieg im Osten 1941—1945.., S. 310.

3. Тамсама. S. 52; *Lenhard Hartmut.* "Lebensraum im Osten": Deutsche in Belorussland 1941—1944.., S. 11.

4. *Lenhard Hartmut.* "Lebensraum im Osten": Deutsche in Belorussland.., S. 11—23.

5. Тамсама. S. 11; *Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R.* Hitlers Krieg im Osten 1941—1945.., S. IX, 52.

6. *Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R.* Hitlers Krieg im Osten 1941—1945.., S. 225—271.

7. Eine Ausstellung und ihre Folgen: Zur Rezeption der Ausstellung "Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944". Hamburg, 1999. S. 9.

8. *Gerlach Christian.* Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland.., S. 11.

9. *Mueller Rolf-Dieter, Ueberschaer Gerd R.* Hitlers Krieg im Osten.., S. 316 —321.

10. Тамсама. S. 323.

11. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Мн., 1999. С. 6.

12. *Літвін А.М.* Антысавецкія ваенна-паліцэйскія фарміраванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1944 гг.: Вытокі. Структура. Дзейнасць/ Аўтарэф. дыс... д-ра гістарыч. навук. Мн., 2000. 37 с.

13. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. Мн., 1994. С. 423; Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 191.

14. Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 4. Мн., 1997. С. 370.

15. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны.., с. 3.

16. *Літвін А.М.* Акупацыя Беларусі (1941—1944): пытанні супрацiву і калабарацыі. Мн., 2000. 288 с.

17. Матэрыялы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Праблемы айчыннай гістарыяграфіі" (Гародня, 19—21 студзеня 2001 г.) // Гістарычны альманах. Т. 4. Гародня, 2001. С. 1—216.

18. Тамсама. С. 190.

19. *Каваленя А.А.* Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941—1944: Вытокі. Структура. Дзейнасць/ Аўтарэф. дыс... д-ра гістарыч. навук. Мн., 2000. 38 с.; *Літвін А.М.* Антысавецкія ваенна-паліцэйскія фарміраванні на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1944 гг.: Вытокі. Структура. Дзейнасць/ Аўтарэф. дыс... д-ра гістарыч. навук. Мн., 2000. 37 с.

20. 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: Матэрыялы навук.-тэарэт. канф., 4—5 мая 2000 г.. У 2 ч. Мн., 2000. Ч. І. 166 с., Ч. ІІ. 168 с.; Трагічнае лета 1941 года: напамін гісторыі. Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя. Мінск, 22 чэрвеня 2001; Мужество и трагедия народа. По материалам "круглого стола", посвященного 55-летию Победы в Великой Отечественной войне. 3 мая 2000. Мн., 2000. 90 с.; Беларусь, 22 июня 1941 года: говорят архивы... Материалы к заседанию "круглого стола", посвященного 60-летию начала Великой Отечественной войны (июнь 2001 г.). Мн., 2001. 145 с.

21. Гл.: 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз гады, новыя канцэпцыі і падыходы: Матэрыялы навук.-тэарэт. канф., 4—5 мая 2000 г.. У 2 ч. Мн., 2000.

22. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны.., с. 114, 191, 192—194, 218 і інш.